БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс: Рэдакцыі Ново-Серпухуская 29. Адміністрацыі Захароуская «Юбілейны Дом».

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня. Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права пераўляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рубл.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб. на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 89. Менск. Нядзеля 14 ліпня 1918 г. Год I

АБВЕСТКА.

На аспові артыкулаў 22, 23, 24, 25 і 112 Становішча 29 верэсня 1917 г. аб меськіх прыбытках, выдатках сметах і патрахунках Менская Меськая Управа апавешчае, аб усе ведалі, што ацэнка нірухомых меняў у месьці Менску дзеля ўзысканпя меськаго ацэначнаго збору у 1918 годзе паводлуг мінулаго году нізмянілася за выключэннем менняў перабудованых і зноў зарэгістрованных, а так сама належачых казённым, царкоуным і манастырскім установам.

Ацэначны збор ад нірухомых менняў у карысьць места Менску па 1918 год вызначэны у размеры 20% чыстай прыбытнасьці ад іх і павінен быць ўнесены у меськую кассу ні пазней 15 жніўня гэтаго году па новаму стылю па разасланых меськай управай акладных лістах.

Зборы, ні ўнесеныя да гэтаго сроку, лічуцца нідаімкай і на іх ад 1-го верэсня г.г. будзе далічацца пэня у размеры 1 кап. ад кожнаго рубля нідаімкі у месяц, нрычым сумы нідаімкі у 50 і болей капеяк лічыцца за поўны рубель і ні кончэны месяц за поуны. Скаргі на ацэнкі павінны быць заяулены Управе ні пазней 1-го жніуня гэтаго году. З 15-го верэсня г.г. ніуплачаная нідаімка збору 1918 году будзе узысківацца праз міліцыю прымусовым спосабам.

8 ліпня 1918 г.

Меські Войт С. Хржонстоускі.
За Сэкрэтара Позняк.
Дзелавод Р. Бортквіч.

№ 72/7926.

Менск 14/VII.

Прасьвета Беларусі.

Перад кабінэтам Скірмунта стаіць гігантская праца вывясьці прасьвету с таго хаоса, які зрабіла рэвалюцыя. Старая сыстэма збанкрутавала і збурэна, а новай інчэ німа. А ні можна ліць новае віно у старыя мяхі.

Навучэнне у роднай мове.

Школа і жыцце ні могуць быць разгарожэны. Школа і беларуская культура павінна быць тым самым, нераздзельным. Да гэтаго часу народная школа мела 2 глауныя навукі: вялікарасійскую мову з сваёй «ять» і чіжегародскім патрыатызмам і арыфмэтыкай. Гэта сыстэма схоластычна-філёгічная для жыцця беларускаго хлопца была мала карысна. Гэтых букву «ять» і Мініна і Пажарскаго ен, як салдат парадны мундзір здаму у чыхауз ніпатрэбных рэчау. Ні стольки трэба вашай школе кніжнаго механічнаго знання, як жывой вустнай бяседы на жывой роднай мове. Каб ен пазнау усю акружаючую яго прыроду, дарамі каторай і ен будзе жыць і дзяды яго карміліся. Шанованнем беларускай мовы, беларускаго быту народнаго, традыцый гісторыі, выховываць трэба з дзяцей суменных беларусау і грамадзян.

Вучыцэлі

Настаунікі маладзежы, ім трэба адвясьці мейсцы на покуці у Беларускай дзержаве. Беларусау па духу ужо паміж вучыцелямі можна знайсьці цэлыя кадры. Ім першае мейсцо. Але есьць беларусы-абрусіцелі, каторым перэвярнулі у сэмінарыях мазгі. Гэта злейшыя ворагі свайго народу, яны ганюць і ніпачытаюць сваю родную матку—бацькаушчыну, яны адкракліся ад сваей мовы, яны плююць на сваю родную хату. Лепш за іх тыя велікарусы і палякі вучылі, каторыя у нас дауно жывуць—у ніх хоць німа нінавісьці да беларускай культуры, і яны яе больш падтрымаюць, чым беларусы абрусіцелі.

Трэба саздаць адну вялікую беларускую вучыцельскую сэмінарыю з паралельнымі класамі і рожныя курсы вучыцельскія.

Кніжкі.

Школьных кніг беларускіх мала, і скора надрукаваць іх у дзесятках тысячах экзэмпляроу німа магчымасьці. У Расіі так сама німа кніжак і, дзякуючы разрусе, іх нібудзе. Але гэту бяду паправіць легка. Трэба толькі каб вучыцель меу усе беларускія кніжкі, тагды ен ужо можэ вучыць дзяцей. Трэба у школах вучыць і расійскую мову і нямецкую, як асобыя навукі, а гдзе хочуць і польскую.

Плата за навуку.

Пры разарэнні і сыстэме паперовых грошы школа наша бедная. А учэнне павінно быць платным, а за бедных вучанікоу павінна плаціць альбо воласьць, альбо гарадзкая дума, ці земства.

Вучыцелям трэба даваць ссылку і трохі грошы. Гэта выгадней, чым калі гаспадар прадасьць 20 ф. хлеба, гэты хлеб пройдзе праз 7 рук, кожны заробіць, а потым вучыцель купіць гэты хлеб па дубальтовай цане.

Трэба, каб грошавых абаротау было наймень.

Будаваць школы трэба так сама здбыткам натураю, а ні паперовымі грошамі.

Народ беларускі рвецца да навукі. Будуюць селяне цяпер гімназыі без ніякой помачы і у Буцлаве Віленск. г. і у Старобіне Слуцкаго пав.

Маршалак прасьветы беларускай дзержавы павінен дальш радзіць і рукаводзіць народнай прасьветай, выдумаць мудрую сыстэму, каб школы беларускія раслі, як грыбы і Беларусь зрабілася эўрапэйскай Дзержавай. Ніхай мы і збанкрутуем выдаючы шмат грошы па школу, але гэта банкруцтво у 10 разоу вернецца праз 3—4 годы.

А. У.

Агульныя весткі.

БАЗЭЛЬ. Саветы у Пецярбурзе і Кронштаце пастанавілі аказаць аружную помач савецкаму ураду у Маскве. У Пецярбурзе так-сама арэштованы верхаводы соцыял-рэвалюцыянэраў.

Савет . . . (у тэлеграме пропуск) пастанавіў аб'явіць сваю нізалежнасьць ад маскоўскаго ураду. Нізалежнасьць сыбірскіх саветаў прызнана Англіей, Францыей і Японіей.

ЦЮРЫХ. Перамена становішча Мілюкова вызвала сільны упадак палітычнаго настраення у Італіі.

Заложанае Мілюковым расійскае прэсс - бюро наказывае: «Сэкрэтарыят заграпічных спраў апублікуе сінюю кнігу з архіваў міністэрства заграпічных спраў с тайнымі дакументамі аб Індыі, каторыя выстаўляюць англіцкі імпэрыялізм у благім сьвятле.

КОПЭНГАГА. «Huwfudstatsbladet» даведалася, што англічане абецаліся расійскім соцыял-рэвалюцыянэрам 625 мільёнаў рублёў на правядзенне англіцкіх плянаў.

БЭРН. Керэнскі ні мае веры і давер'я спаўніцельнай камісіі соцыял-дэмакратычнай партыі у Парыжы. Пасьля яго апошняе прамовы выказалі поўнае нідавер'е да яго палітычнай дальнозоркасьці.

ГААГА. У розных англіцкіх фабрыках аэроплянаў узьнялася забастоўка. «Daily Express» наказывае, што бастуе больш за 20.000 работнікаў.

БЭРН. Аб катастрофе у Грэноблі наказываюць:

4 ліпня у 3 гадз. раніцай быў першы вялізарны узрыў. У чысьленых хатах заваліліся сьцены. Узьнялася паніка. Место было абнято густымі хмарамі дыму. Пасьля пачаўся рад узрываў, трываўшых да 11 гадзіны вечара. Даваць помач было вельмі цяжка. Зносіны з Ліопам чыгункай былі прыпынены. Праз усю ноч жыхары уцекалі на захад. Страты нізвычайна вялікі. Піротэхнічныя варштаты, каторыя заўсёды станавілі нібазпеку для Грэнобля, будуць перанесены у другое мейсцо.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ (Мілі). Палудзена-каўказкі камітэт пратэстуе проці заяў грузінскаго дэлегата у Бэрліне. Пакуль Нямеччына прыхільна і у дружбе з османскім халіфатам, ні будзе на сьвеце турка—ворага немцаў.

КОУНА. «Baltisch-Litauischen Mitteilungen» наказываюць, што губэрнатар Рыгі генэрал ф. Альтэн пакідае сваё становішчо. Нямецкія і латышскія газэты у Рызе пішуць, што генэрал ф. Альтэн здабыў сваей справядлівасьцю прыхільнасьць усяго насялення.

Ф. Альтэн быў у 1916 годзі губэрнатарам Вільні.

МАДРЫД. Левыя радыкальныя і рэспубліканскія партыі апавешчаюць супольную заяву, у каторай між іншым гаворыцца:

«Дэпутаты меншасьці пастанавілі ні заседаць больш у парлямэнці, бо ўрад лічыцца толькі с сваімі староннікамі. Апозыцыйныя партыі будуць за сьценамі парлямэнту пільна сачыць за ўсімі паступкамі ўраду і паддзэржываць у народзе апозыцыю.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Сягоння ў вечары прывезана з Масквы труна с целам забітаго імператарскаго нямецкаго пасла, гр. Мірбаха.

НАШВІЛЬ (Рэўтэр). Пры сустрэчы двох пасажырскіх паездоў забіты 100 асоб. Бальніца перапоўнена. Раненых больш за 80 асоб.

ЛОНДОН (В.Т.Б.). Адміралцейства наказывае:

Семера нямецкіх лятуноў атакавалі англіцкія падводныя лодкі, кідаючы бомбы і стрэляючы с кулямётаў. Забіты 1 ахвіцэр і 5 салдатоў. Пацярпеўшая падводная лодка прыведзена ў порт другой на буксіры.

ЛОНДОН (Рэўтэр). У ніжняй палаце лёрд Сэсіль заявіў, што між Англіей і Галяндзіей ні здарылося нічога, што пярэчыло-бы ўстаноўленаму праву аб канвою з ваенных караблёў пры тарговых параходах.

БАЗЭЛЬ. Ірляндзкія прафэсыянальныя саюзы, згодна з весткай «Daily Mail», распушчэны па загаду віцэ-караля за падгатоўку гасударственай здрады.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Урадова. Нашыя падводныя лодкі ў паясе блёкады навакол Англіі затапілі ізноў 16.500 тонн.

БЭРЛІН. Між расійскім паслом і баўгарскім поўпамочнікам учора адбылася менка дакумэнтамі аб Берасьцейскай умове.

Весткі з Расіі.

МАСКВА 10 гм. «Вольф». Труна с целам гр. Мірбаха у панядзелак па абедзі адпраўлена у Нямеччыну. На вагзалі Чычэрын ішчэ раз выказаў шчыры сум расійскага ураду с прычыны сьмерці чалавека, які бароўся за мір.

МАСКВА. Усерасійскі конгрэс саветаў зацьвердзіў упутраную і заграпічную савецкую палітыку. Большэвікі заўладалі дакумэнтамі, які даюць ясны доказ, што контр рэвалюцыянэры праэктавалі цэлы рад нападаў на нямецкіх і аўстрыйскіх чыноўнікаў у Расіі забойства у Петраградзі коміcара да спраў друку Володарскаго—гэтак само тэррорыстычны акт, вызваны саюзьнікамі.

З Украіны.

КІЕУ. С Пецярбургу з'еждакицца сюды у Кіеў члены кадэцкай партыі і аргапізуюцца навакол Мілюкова. Мілюкоў заявіў, што ён належыць да меньшасьці кадэцкай партыі, каторая стаіць за згоду з аўстрыякамі і немцамі.

КІЕУ. Першая партыя цукру 300.000 пудоў выслана у Нямеччыну. Цукер будзе прадавацца па 100 марак пуд.

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

МАЛАДОСЬЦЬ—ДУРНОСЬЦЬ.

Цэлых восем чалавек—добрай вялічыні сямейка; адзін з сошкай, а сямера з лыжкай. Усе да працы рвуцца, толькі ні да чаго нінадаюцца. Дау Бог сьмеласьці—так што ні стыду ні увагі ні маюць, але ні дау ім Бог жандарау, паліцыі і войска—дык самі зьдзекуюцца над другімі. Для іх законау німа, бо які гэта закон без «сілы». Ім непашта законы і самім пісаць, бо рашэння большасьці есьць «насиліе», гвалт над меньшасьцю. Анархія—сьвятая рэч! Называцца толькі анархістамі—ні у модзе ішчэ, леней—«соцыялістамі рэвалюцыянэрамі». Падбуравыць беларусоу ніпавісьці да другой нацыі—рэвалюцыю значыцца заводзіць.

Называць якуюсьці суседнюю нацыю «піпекнай»—гэта, мабыць, ясна цытавана з лю бой з соцыялістычных праграм адабраць ад каго бы то ні было зямлю—гэта ні «нацыялізацыя» а ось «соцыялізацыя» будзець! Сказана ясна, як і належыцца людзям з вывяскай соцыялістау рэвалюцыянэрау, але без духу і розуму соцыяліста рэвалюцыянэра.

Э. Б.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Павялічэнне прычта. Епіскопам Гэоргіем гэтымі днямі была прынята дэлегацыя ад парахвіян пэрэспенско кладбішчэнскай цэркві, хадатайствовавшая аб павялічэнні прычта, дзеля таго што мейсцовы сьвяшчэнік Флерау ні спрауляецца.

С прычыни ніумела выказанай прозьбы, дэлегацыя мела ніудачу.

Сярод чыноўнікау. Служачыя казенай палаты і казначэйства нідауна хлапатали аб павялічэнні істнуючай пэнсіі на 25⁰/₀.

Цяпер с паляпшэннем свабодных грошай казначэйства прасіцелі спадзяюцца адтрымаць прыбауку у бягучым мэсяцы.

Цэны на тавары. Ад 12-го ліпня, па загаду нямецкіх уласьцей усе таргова-прамысловыя інстытуцыі (крамы і магазіны) павінны мець на таварах цэны, выстауленыя у марках і акупацыйных рублях.

Разгляд снаргау хаурасам домауласьнікау, прынесяных абыватэляаі места на нізаконныя пастановы б. меськай думы, адбыуся 9, 10, 11 і 12-го ліпня.

Па Ліб.-Ром. ж. д. Эксплоатацыя зноу сформаваная і ліквідацыя, сплеушыся у адзін вузел, прывядуць раней усяго да ухутчэння ліквідацыі упрауленскіх аддзелау, бо без здачы у архіу ранейшых упрауленскіх спрау (у да-акупацыйны час) ні мажліва новаму начальніку эксплоатацыі Расетто пачаць якія кольвек рэформы.

Дзеля гэтаго ліквідацыю стараго упраулення Л. Р. ж. д. рэшэно закончыць ні позьней 1-го верэсьня.

Беларускі тэатр.

У аўторак, 16 ліпня, у гарадзкім тэатры будзе беларускі спэктакль. Будзе іграна першы раз у Менску пьеса у 4 дзеях Ф. Алехновіча «Манька». Пасьля спэктаклю будзе сьпевацъ беларускі хор пад загадам п. Цэраўскаго і будзе дэкламацыя.

У пьесе «Манька» аўтор дае трагэдыю маладой простай шчырай селянскай душы, каторая, апынуўшыся у месьці, у ніпаемай для сябе сфэры, між новымі людзьмі, спатыкаецца з мествовай манай і ніщчырасьцю і, пітраваўшы у ніраўнай барацьбе, падае падломленая, як кветка у полі, сьцятая у час жніва безжалясным сярпом...

Пачатак спэктаклю а $8^{1}/_{2}$ гадз. у веч.

Рэжысэрыюць п. Ф. Ждановіч і аўтор пьесы.

З дарогі.

З Маладэчна у Менск на капах з таварамі ехау я больш сутак, два разы аддыхаючы у дарозе. Дарогай любавауся усімчым на бакі разглядаючыся. Цешыла мяне урода палеу—добрае жыто і добрая ярына; цешыла мяне траука вялікая на пожнях і у пакосах. Сялібы шмат дзе стрыкатымі сталі, бо наміж старых будынкау і новыя заводзяцца. Бярвенне — хоць любуйся —, такое добрае але німаш ладу у будоуца, бо у гаспадароу, німа дагадкі як лепей будавацца, а са старамы німа каму дбаць аб стройнай адбудове нашага краю.

Спатыкаючы пры рабоці людзей пацешыцца есьць чым, калі відзіш моладзь за дзелам бо быу час, калі яна найбольш часу траціла балагурамі пра партыйныя праграмы. Цяпер у воласьці па сходах ні моладзь галасуіць, а старыя. І пра беларускую Раду у Менску найбольш старыя дапытываюцца: а каліж Рада будзе добры лад рабіць у нас? Хто нам школы дасць, хто іх утрымліваць будзе?

А. Б.

Весткі с краю.

З Вільні.

Беларускі тэатр. Пасьля даўжэйшай перадышкі беларуская драматычная дружына пачынае рыхтавацца да восенняго сэзону. Прыбываюць новыя сілы і апрацоўваецца плян далейшай работы.

С прычыны выезду ў Менск доўгалетняго і заслужонаго кіраўніка беларускаго тэатру у Вільні, п. Ф. Алехновіча, найбольш важнае пытанне—выбар заступніка яго. Трэба спадзевацца, што пытанне гэтае ўдасца разьвязаць шчасьліва, і далейшая праца віленскай драматычнай дружыны ні задзержыцца.

Дзеля правільнаго разьвіцця беларускай сцэнічнай работы апрацоўваецца праэкт рэарганізацыі драматычнай дружыны на новых асновах.

Забарона капаць бульбу. На чальнік упраулення Літвы апавешчае загад, паводлуг катораго капаць бульбу да атрымання пазваления на гэта забаронено. Выключэння робіцца толькі на моцы асобнаго пазваления Stadthauptmanne. За нарушэнне гэтаго загаду карацімуць вастрогам да 6 тыдняў або штрафам грашмі да 2.000 м. Выкапаная бульба конфіскуецца.

Павышэнне цаны лену. Каб падахвоціць гаспадароў да разводкі лёну, Глаўнакамандуючый на Усходзі павялічыў цэны на лён. За 100 кілёгр. нячышчэнаго лёну будуць плаціць—залежна ад сорта ад 170 да 110 марак, а за чышчэны лён за 100 за 100 кіл. (6 пудоў) — 280 м.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 12 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяў Кронпрынца Рупрэхта.

Артылерыйская дзеяльнасьць ажывілася у вечары і усілілася у ночы да буйнаго агня, накіраванаго на пазыцыі і тыл. Паўднёва-захадней Іпэрна і Бэйеля, а так-сама паўночней Альбэра былі ні раз адбіты сільныя атакі варожых разведачных атрадау.

Група арміяў Гэрманскаго Кронпрынца.

Між рэкамі Эн і Марнай дзеяльнасьць французаў асталася ажыўлёнай. У боях каля леса Віллер—Коттэрэ мы захапілі палонных. Усходней Рэймса мы адбілі атакі варожых разведчыкау.

Лейтэнант Ніккель меў сваю 20-ую перамогу у паветры. Пры ўчарайшым амэрыканскім налёці на Каблєнц збіт ишчэ шосты самалёт.

Першы Гэнерал-кватэрмэйстар **Людэндорф.**

Городня. Цяпер часта здараецца, што людзі, раздзеленыя некалькі гадоў вайной: муж і жонка, бацькі і дзеці, сёстры і браты,—ізноў знаходзяць адзін аднаго. Маса людзей варочаецца дамоў; ішчэ больш выехаўшых у Расію ў 1915 годзі сваей ахвотай, ці пад прымусам, дагэтуль ні вярнулося.

— 6 чэрвеня 1918 году Тэма Лея Сталярская памылялася вывесьці с крамы Рубінрэйта купцоў і заклікаць да свае крамы. Міравы суд засудзіў яе на 2 месяцы ў вастрог.

— Першая партыя эмігрантаў у Расію выехала адгэтуль 10 ліпня а 5 гадз. па раніцы.

Беласток. 10 ліпня адгэтуль выхала першая партыя эмігрантаў у Расію.

Свіслоч. Пяты курс у тутэйшай беларускай вучыцельскай сэмінарыі пачынаецца 15 жніўня. Ен будзе трываць 6 месяцаў.

Маладыя людзі, скончыўшыя найменш пpыходскую школу, калі хочуць паступіць у сэмінарыю, павінны ні пазьней 1 жніўня заявіцца у свайго Stadtbauhtmanna, ці Kreishauptmanna.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.